

Жыве Беларусь!

# НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№213 (726) 29 кастрычніка 1993 г. Пятніца. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 500400 экз. Кошт у розніцу — 15 руб.


## ФАКС

### "Нефть из соглашения не потечет"

**Экономический союз в рамках СНГ не даст Беларуси дешевой нефти, поскольку вся она находится в распоряжении заводов-изготовителей и коммерческих структур России, с которыми и надо вести дела, а не сидеть сложа руки, иждивенчески надеясь на административное распределение.**

Об этом заявил во время недавнего пребывания в Витебске посол России в Беларуси Игорь Сапрыкин.

Посол высказал в связи с этим также недоумение по поводу отсутствия белорусско-российских совместных предприятий.

**Степан СТАРОЖИЛ.**

### Молоко. Но в два раза дороже

**Как сообщил заместитель начальника Департамента цен Александр Павлович Грецкий, с 1 ноября в 2 раза повышаются цены на молоко, молочнокислые продукты и хлебобулочные изделия, которые продавались по фиксированным ценам.**

Одновременно, чтобы обеспечить социальную защиту населения, с 1 ноября повышается до 20 тысяч рублей минимальная зарплата и до 22 тысяч — ставка I разряда.

**Анатолий РОМАНОВИЧ.**

### Свой автомат ближе к армии?

**Как стало известно, на одном из столичных заводов ведется активная работа по созданию автомата типа "Узи".**

Однако он не будет "слепой копией" своего израильского собрата. По мнению специалистов, белорусский автомат ничем не уступит по своим техническим параметрам и стоить будет дешевле.

**Андрей ЯНЧУК.**

### Этот номер не пройдет?

**На грани закрытия районная бобруйская газета "Трыбуна працы".**

Израсходован годовую сумму дотации, издание перебивается с копейки на копейку. Его сотрудники зарплату за сентябрь получили только на этой неделе. Такая участь не сегодня-завтра может постигнуть и другие "районки" Могилевщины, поскольку в бюджетах районов и областей средств на их финансирование практически нет.

**Николай КОМЛЕВ.**

### Неблагоприятные дни ноября в геофизическом плане

**2, 6, 15, 20, 25, 28.**

(По данным лаборатории медико-экологических проблем, профилактики Института клинической и экспериментальной медицины Сибирского отделения АМН России.)

### Футболистки закончили. Чемпионат

**Завершился второй чемпионат Республики Беларуси по футболу среди женских команд. Итоговая таблица чемпионата**

| | И | В | Н | П | М | О |
|---|---|---|---|---|---|---|
| "Надежда" (Могилев) | 12 | 12 | 0 | 0 | 62-1 | 24 |
| "Трикотажница-Орнина" (Бобруйск) | 12 | 9 | 0 | 3 | 68-10 | 18 |
| "Электроника" (Минск) | 12 | 6 | 2 | 4 | 15-16 | 14 |
| "Трикотажница-Смена" (Бобруйск) | 12 | 4 | 4 | 4 | 19-24 | 12 |
| "Юность" (Могилевский р-н) | 12 | 3 | 1 | 8 | 8-37 | 7 |
| "Виктория" (Брест) | 12 | 2 | 2 | 8 | 14-54 | 6 |
| "Гомельчанка" (Гомель) | 12 | 1 | 1 | 10 | 5-49 | 3 |

Сыграны четверть финальные и полуфинальные игры Кубка Беларуси. Вот их итоги: "Электроника" (Минск) — "Трикотажница" (Бобруйск) — 0:1. "Трикотажница-Смена"(Бобруйск) — "Надежда" (Могилев) — 0:2. 3 ноября в 13.00 на минском стадионе "Трактор" в споре между "Надеждой" и "Трикотажницей" будет разыграно, кому владеть Кубком Беларуси.

### Вкратце

**27 октября министр иностранных дел Беларуси Петр Кравченко принял Чрезвычайного и Полномочного Посла Королевства Нидерланды в Республике Беларусь Шурда Госсеса. В состоявшейся беседе обсуждались различные аспекты дальнейшего развития двусторонних отношений.**

В тот же день П.Кравченко отбыл в Нью-Йорк для участия в продолжающейся 48-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН.

❑

**Сегодня состоятся выборы в непостоянные члены Совета Безопасности Организации Объединенных Наций.**

Республика Беларусь выдвинула свою кандидатуру в этот орган, один из главных в системе ООН, основной функцией которого является поддержание мира и международной безопасности.

❑

**Дни экономики федеральной земли Баден-Вюртемберг в Минске помогут укрепить старые и наладить новые контакты между предпринимателями Беларуси и Германии.**

Их официальное открытие состоялось 28 октября.

❑

**5 ноября в Минске состоится заседание политбюро христианско-демократического союза Восточной Европы, в котором примут участие представители христианско-демократического интернационала.**

Приглашены также представители России, Украины, Молдовы, Армении, Грузии.

❑

**На заседании первого комитета Генеральной Ассамблеи ООН, который займется вопросами разоружения и международной безопасности, выступил член белорусской делегации А.Байчоров.**

Он высказал благодарность за помощь, которую оказывает международное содружество. Однако белорусский делегат с сожалением отметил ее несоответствие реальным потребностям.

❑

**На очередном расширенном заседании объединения демократических сил "Весна-94" были обсуждены текущие вопросы организационного, а также экономического содержания.**

Пресс-служба "Весны-94" сообщает, что присоединение к объединению демократических сил организаций и частных лиц продолжается.

❑

**Белорусский комитет защиты мира передал во Францию обращение, в котором содержится призыв к французскому правительству не производить у себя на родине ядерных испытаний.**




Рисунок Олега ПОПОВА.

### Отличился — получи. Зарплату

**С нынешнего учебного года все отличники с пятого по выпускной класс могилевской школы N 33 по окончании каждой четверти будут получать стипендию в размере установленной в республике минимальной зарплаты.**

Инициатором введения стипендии в школе выступил коллектив подшефного завода "Техноприбор".

**Николай ЗАПОЛЬСКИЙ.**

### "Непредусмотренный" храм

**Барановичский горисполком не дал разрешения вновь созданной в городе католической общине Матери Божией Фатимской на строительство храма в Северном микрорайоне.**

Это единственный случай отказа в строительстве храма. Власти ссылаются на то, что, согласно генеральному плану застройки города, в Северном микрорайоне строительство храма не предусмотрено.

**Елена БЕРЕСНЕВА.**

### Грабили кому не лень

**Комиссии, созданной президентом Б.Ельциным по передаче дел бывшего Верховного Совета России, стали известны многочисленные подробности грабежа ценных вещей бывшими защитниками "Белого дома".**

Об этом рассказал журналистам бывший депутат Российской Федерации А.Починок. Особенно основательно поработали "патриоты Советского Союза" в подарочной кладовой, ценностями в которой распоряжается секретариат Хасбулатова. В помещение проникли, аккуратно распилив дужку замка, скорее всего "свои люди". Из футляров извлечены особо ценные ювелирные изделия. Исчезло много часов в корпусах из драгметаллов, коробок с дорогими духами. Украдены тысячи единиц кузнецовского фарфора. Из помещений тащили всё: телевизоры, компьютеры, полотна картин, книги... По самым скромным подсчетам, в "Белом доме" разворовано ценностей на сотни миллионов рублей. А с поличным взяты считанные мародеры и грабители.

**Леонид ФАДЕЕВ.**



**Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН и РИД.**

*У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь*

## Праграма барацьбы са злачыннасцю адпраўлена на дапрацоўку

**Пад старшынствам Станіслава Шушкевіча адбылося пасяджэнне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.**

Як паведаміла прэс-служба Вярхоўнага Савета, разгледжаны пытанні падрыхтоўкі да трынаццатай сесіі парламента, якая пачне работу 9 лістапада. Заслуханы справаздачы Генеральнага пракурора рэспублікі Васіля Шаладонава, міністра ўнутраных спраў Уладзіміра Ягорава, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Эдуарда Шыркоўскага аб мерах па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю.

Члены Прэзідыума выказалі асаблівую трывогу ў сувязі з пагаршэннем крымінагеннай сітуацыі ў рэспубліцы. Адзначалася, што злачыннасць усё больш актыўна пранікае ў эканоміку, падрывае грамадскую мараль, стварае пагрозу для жыцця людзей.

Павялічваецца колькасць асабліва небяспечных злачынстваў, такіх, як забойствы, цяжкія цялесныя пашкоджанні, разбойныя напады, крадзеж дзяржаўнай уласнасці. Усё часцей пры ўчыненні злачынства выкарыстоўваецца зброя. Меры ж, якія прымаюцца праваахоўнымі органамі рэспублікі па барацьбе са злачыннасцю, не адпавядаюць яе сённяшнім маштабам і росту.

Прынята рашэнне дапрацаваць праект Дзяржаўнай праграмы аб першачарговых мерах па ўзмацненню барацьбы са злачыннасцю.

Абмеркаваны ход выканання Саветам Міністраў пастановы Вярхоўнага Савета ад 17 снежня 1992 года "Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях".

Прэзідыум прыняў рашэнне аб устанаўленні дыпламатычных адносін з Рэспублікай Ангола і Руандыйскай Рэспублікай.

Разгледжаны таксама пытанні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь, хадайніцтвы аб памілаванні і іншыя.

**Белінфарм.**

*Хроніка*

## З прафсаюзамі таксама трэба раіцца

Учора адбыўся пленум Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Значнасць яму надала тая акалічнасць, што перад прафсаюзнымі лідэрамі выступіў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч.

Кіраўнік парламента вырашыў давесці да ведама шырокіх працоўных мас свае меркаванні па "бягучаму моманту". Не пагаджаючыся з некаторымі акцыямі прафсаюзаў, Шушкевіч тым не менш прызнаў гэта фарміраванне вельмі значным у палітычным жыцці рэспублікі.

Па пытанню датэрміновых выбараў у Вярхоўны Савет Шушкевіч выказаўся даволі стрымана. Адзначыўшы пэўныя хібы ў рабоце парламента і ўрада, ён, аднак, сцвярджаў, што ўладныя структуры даволі трывала валодаюць абстаноўкай.

На працягу гадзіны Станіслаў Шушкевіч адказваў на пытанні ўдзельнікаў пленума.

**Віктар ХАРОШКА.**

*Открытое письмо*

## Большинство льнозаводов не работает!

*Председателю Верховного Совета Республики Беларусь Шушкевичу С.С.*
*Председателю Совета Министров Республики Беларусь Кебичу В.Ф.*
*Председателю правления Национального банка Республики Беларусь Богданкевичу С.А.*

В льноводстве сложилась кризисная ситуация. Большинство заводов не работает из-за резкого повышения цен на топливно-энергетические ресурсы, кабальных условий кредитования.

Цены потребителей льноволокна лишь на треть покрывают затраты производства. Поставки на экспорт неэффективны из-за налогов и обязательной продажи полученных средств Государственному валютному фонду Республики Беларусь по заниженному инвестиционному курсу.

Предоставление льнозаводам кредита под 171 процент для оплаты закупаемого сырья с погашением его не позднее декабря 1993 года, хотя перерабатывается сырье в течение 12 месяцев, является основным звеном в тяжелой цепи, которая душит льноводство.

Неоднократные, в течение 1993 года, обращения в Министерство сельского хозяйства и продовольствия, Совет Министров Республики Беларусь с конкретными мерами по спасению перерабатывающей отрасли остались без внимания.

Руководство Совета Министров, его ответственные работники вместо решения вопросов и принятия конкретных мер занялись выдачей ни к чему не обязывающих обещаний и отписками.

Для спасения отрасли считаем необходимым:

1. Выделить льнозаводам льготный кредит для оплаты топливно-энергетических ресурсов.

2. Не распространять действие пункта 4 постановления Совета Министров Республики Беларусь N 645 "О первоочередных мерах, направленных на преодоление топливно-энергетического кризиса" на льнозаводы.

3. Освободить льнозаводы от уплаты налога на валютную выручку и обязательной продажи 20 процентов валютной выручки в Государственный валютный фонд.

4. Установить дотацию на закупаемую льнотресту и льносоломку урожая 1993 года, обеспечивающую покрытие затрат на производство льноволокна с учетом оптовой цены, выплачиваемой Оршанским льнокомбинатом и другими потребителями.

5. Установить срок погашения выделенного кредита для закупки льносырья до конца переработки льнотресты и льносоломы, снизив процентную ставку платы за него до 30 процентов.

6. Разработать и утвердить на уровне Совета Министров меры по стабилизации льноводства в 1994—1995 годах.

7. Создать на уровне республики единый орган по управлению отраслью льноводства на хозрасчетной основе. Учредителями этого органа должны быть областные льнообъединения, Оршанский льнокомбинат, другие постоянные потребители льноволокна Республики Беларусь, институт льна, хозяйственные органы, в подчинении которых находятся экспортные базы и льносемстанции.

Не дайте погибнуть льну! Народ Республики Беларусь этого не простит.

**Генеральные директора льнообъединений:**

**Минского — Николай ДУБИЦКИЙ, Могилевского — Николай ОСИПОВ, Гомельского — Василий ЯЦЕВИЧ, Витебского — Иван АЛТЫЦА.**

**Директора льнозаводов: Березинского — Геннадий МАКОВИЧ, Красненского — Александр МАНЬКОВСКИЙ, Воложинского — Георгий АРТЮШКЕВИЧ, Крупского — Василий ХОМИЧ, Любанского — Ева БРАГИНЕЦ, Несвижского — Михаил КРИШТАПОВИЧ, Пуховичского — Николай ШКЛЯНКО, Слуцкого — Иван ШАНЬКОВ, Дзержинского — Геннадий СТАРОВОЙТОВ, Горецкого — Виталий ЕВТИХОВИЧ, Кировского — Петр ЩЕРБИЧ, Круглянского — Леонид РЕУТ, Мстиславльского — Николай ПИВАНКОВ, Хотимского — Николай КУРЗЕНКОВ, Шкловского — Алексей ВАГИН, Бешенковичского — Зинаида ХОДЯНОК, Богушевского — Геннадий ВИННИКОВ, Браславского — Михаил ЛЕВИТ, Бычихинского — Анатолий КОЛЦА, Верхнедвинского — Виктор СТАНКЕВИЧ, Городокского — Борис КРЫЛОВ, Дубровенского — Анатолий БОСЕНКОВ, Кохановского — Михаил МЕДВЕДСКИЙ, Лепельского — Людвиг ВАЛЬТОН, Лиозненского — Григорий МЕДВЕДЕВ, Миорского — Николай КАРАНКЕВИЧ, Мосарского — Петр ОЛЬШЕВСКИЙ, Ореховского — Анатолий БУЛОХОВ, Плисского — Николай АНИСЬКОВИЧ, Полоцкого — Алексей СТЕПУК, Поставского — Геннадий МАЙЗЕЛЬС, Сенненского — Анатолий ШЕДЕНКОВ, Толочинского — Василий ДАДЕКО, Ушачского — Леонид ШАЙТОР, Чашникского — Леонид ЗАЛЕССКИЙ, Шумилинского — Владимир СУМНИКОВ, Горочичского — Иосиф МАЦУКА, Кормянского — Виктор КОВАЛЕВ, Речицкого — Владимир ШЕИН, Тереховского — Николай КОРОЛЕНКО, Уваровичского — Григорий ШАРИКОВ, Жлобинского — Петр ХОРТ.**

*Пазіцыя*

# Мы зрабілі свой выбар!

**Людміла ПЕЦІНА, старшыня Жаночага хрысціянска-дэмакратычнага руху Беларусі**

Наш час адзначаны адлікам новай гісторыі суверэннай Беларусі. Ідзе радыкальная трансфармацыя палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Можна канстатаваць зародкі грамадзянскага ладу — шматпартыйнасць. З'явіліся і альтэрнатыўныя жаночыя арганізацыі, якія ўзніклі не па рашэнню "зверху", а ўтварылі іх самі жанчыны. Адной з іх з'яўляецца Жаночы хрысціянска-дэмакратычны рух Беларусі, асноўнай мэтай якога — абарона правоў жанчыны і сям'і, дэмакратызацыя і духоўна-маральнае адраджэнне грамадства.

Па становішчу жанчыны ў грамадстве вызначаюць яго культурны і эканамічны ўзровень, будучыню краіны. Які ж ён, наш узровень? У якім становішчы знаходзяцца жанчыны Беларусі? Паспрабую адказаць на гэтыя пытанні.

Савецкая ідэалогія ўвесь час сцвярджала, што жанчына пры сацыялізме абсалютна свабодная і мае ўсе магчымасці для самавыяўлення і дасягнення сваіх мэт у жыцці. Сапраўды, жанчыны сталі свабоднымі ў выбары прафесіі, але яны жывуць пад трайным уціскам. Дзяржаўная палітыка, з'арыентаваная на танную рабочую сілу, вымагае ад жанчыны спалучэння вытворчых, сямейных, хатніх і мацярынскай роляў. Паводле гэтай жа канцэпцыі і сям'я разглядаецца як падсістэма, якая забяспечвае людскімі рэсурсамі грамадскую вытворчасць. Інтарэсы дзяржавы пастаўлены вышэй інтарэсаў жанчыны, прычым яна пазбаўлена сацыяльнай абароненасці прыроды свайго полу. Сацыялізм не прынёс сапраўднага вызвалення жанчыне, бо нельга вызваліць пол без вызвалення асобы.

Але нягледзячы на тое, што жанчыны складаюць самую вялікую сацыяльную групу, яны практычна выключаны з працэсу прыняцця рашэнняў на ўсіх узроўнях. Палітычныя перамены не закранулі становішча жанчыны. Па-ранейшаму ёй адводзіцца роля аб'екта, а не суб'екта сацыяльных пераўтварэнняў. Гэта бачна па наступных тэндэнцыях:

у палітыцы — выцясненне жанчыны са структур заканадаўчай і выканаўчай улад;

у эканоміцы — узмацненне дыскрымінацыі ў аплаце працы, прыёме на работу і звальненні, фемінізацыя беднасці;

у заканадаўчай сферы — арыентацыя на прыняцце мер, якія накіраваны на вывад жанчыны з грамадскай вытворчасці, а не на інтэграцыю ў новыя эканамічныя адносіны;

у сферы культуры — узмацненне прапаганды патрыярхальных узаемаадносін паміж паламі, з аднаго боку (так званая ідэалогія прыроднага прызначэння), і масавая эксплуатацыя сексуальнасці на падставе камерцыялізацыі жаночага цела — з другога.

З-за адсутнасці дзіцячага харчавання і лекаў, нізкага ўзроўню працы дзіцячых устаноў і ўстаноў аховы здароўя, немагчымасці сумеснага з дзецьмі адпачынку, дарагавізны дзіцячага адзення і многага іншага пагаршаецца жыццё і жанчын-маці.

Функцыя мацярынства фактычна пазбаўлена грамадскай падтрымкі. А сацыяльная знявага мацярынства пацягнула за сабой маральную дэградацыю жанчыны. Грамадства пазбавіла жанчыну магчымасці быць бездакорнай у вачах свайго дзіцяці, забыўшыся, што ад сацыяльнай устаноўкі маці залежыць і сацыяльная арыентацыя дзяцей.

Пераход да дэмакратыі адбываецца ў вельмі складаных умовах. Большасць жанчын у гэтым працэсе пакуль што не ўдзельнічае. Паляпшэнне становішча жанчын немагчыма без карэнных змен у іх свядомасці, без развіцця шырокага жаночага руху ў розных формах.

На жаль, доўгія гады выкарыстання жаночай сацыяльнай актыўнасці ў мэтах палітычных маніпуляцый адвярнулі жаночае асяроддзе ад палітыкі. У савецкі час існавала сетка жаночых арганізацый: жансаветы, Камітэт савецкіх жанчын з рэгіянальнымі аддзяленнямі. Але ў сваёй большасці яны разглядаліся самімі жанчынамі не як органы абароны іх інтарэсаў, а хутчэй як дадатковы размеркавальнік розных паслуг. Арганізаваныя "зверху" жаночыя структуры ніколі не былі самастойнымі ў прыняцці рашэнняў.

Радыкальная змена становішча жанчыны і сацыяльнай сітуацыі немагчыма без уваходу жанчын у палітычныя структуры. І тут паўстае пытанне аб неабходнасці новага тыпу палітычнай культуры і палітычнага дзеяча, праблема маральнасці палітыкі, якую павінны ажыццяўляць людзі, арыентаваныя не на дасягненне і захаванне ўлады, а на вырашэнне сацыяльных праблем. Другая праблема заключаецца ў тым, як увайсці ў палітычныя структуры, змяніць іх, зрабіць іх полем выяўлення сацыяльных праблем, а не выяўлення ўласных ці палітычных амбіцый. На жаль, у грамадстве, у якім няма традыцыі незалежнага жаночага руху, выкарыстоўванне "жаночых пытанняў" можа прывесці да падмены аднаго тыпу палітычнага маніпуліравання другім. Мы павінны бачыць гэтую небяспеку і не дазваляць ніякім партыям і рухам будаваць сваю палітыку і заваёўваць нашы галасы пры дапамозе палітычных маніпуляцый жаночымі праблемамі. Толькі тая палітычная структура, якая рэальна, на справе ўключае жанчын у працэсы прыняцця рашэнняў, можа разлічваць на падтрымку з іх боку.

Жаночы хрысціянска-дэмакратычны рух Беларусі не імкнецца гаварыць ад імя ўсіх жанчын Беларусі, не бярэ на сябе такіх паўнамоцтваў, але ён адкрыты для ўсіх жанчын, якія шукаюць свой адказ на "жаночае пытанне" і каму неабыякава будучыня Беларусі.

Гарантам праў жанчыны можа быць толькі дэмакратычная дзяржава з развітой эканамічнай і сацыяльнай сферамі. Беларусь у поўнай меры спазнала таталітарны тэрор і на сённяшні дзень уцягнута ў эканамічны і сацыяльны рэгрэс. Разам з краінамі СНД яна ўваходзіць у адну з самых адсталых зон свету, якая рэгрэсіруе рэкорднымі тэмпамі: ад 7 да 10 працэнтаў у год. Беларусь павінна зрабіць выбар шляху развіцця, выбар сваёй палітычнай і сацыяльнай мадэлі грамадства.

Зыходнай кропкай хрысціянскай дэмакратыі з'яўляецца чалавек, прымірэнне чалавека і грамадства ў свабоднай справядлівай дзяржаве. У краінах Усходняй Еўропы, якія пацярпелі ад камунізму, ёсць вялікая патрэба ў агульнай федэральнай Еўропе, заснаванай на прымірэнні і на сапраўднай салідарнасці паміж імі.

Хрысціянская дэмакратыя мае даўнія карані і ў гісторыі Беларусі. Тлумачыцца гэта тым, што Беларусь была заўсёды арыентавана на Еўропу, адчувала сябе далучанай да заходняга тыпу еўрапейскай цывілізацыі. Хрысціянска-дэмакратычны рух у Беларусі нарадзіўся ў 1917 годзе ў асяроддзі каталіцкага духавенства. Дзейнасць яго паспяхова развівалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Але пазней парасткі хрысціянскай дэмакратыі ў Беларусі пачалі знішчацца — спачатку польскімі рэпрэсіўнымі ўладамі, а пазней, пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з Савецкай, былі канчаткова загублены сталінскім тэрорам. Такім жа або падобным быў лёс усіх хрысціянска-дэмакратычных партый Еўропы — яны не вытрымалі націску таталітарызму.

Але калі ў Заходняй Еўропе хрысціянска-дэмакратычныя партыі адрадзіліся пасля другой сусветнай вайны і змаглі перамагчы таталітарызм, то ў Беларусі адраджэнне хрысціянскай дэмакратыі стала магчымым толькі ў апошні час.

Мы разумеем, што дэмакратыю немагчыма ўвесці адным дэкрэтам — вялікія перамены не адбываюцца адразу. Немагчыма адразу ўзнавіць тое, што на працягу дзесяцігоддзяў руйнавалася. Але, з другога боку, Беларусь сёння мае шанц успомніць пра свой невялікі вопыт хрысціянскай дэмакратыі і скарыстаць багаты вопыт Заходняй Еўропы, становішча ў якой пасля другой сусветнай вайны было падобна да цяперашняга становішча ў незалежных дзяржавах былой савецкай імперыі.

А каму сёння мы можам адрасаваць сваю заклапочанасць становішчам жанчын у Беларусі: ураду, Вярхоўнаму Савету, палітычным партыям? Сёння мы звяртаемся да саміх сябе, бо без змянення нашай асабістай свядомасці і асэнсавання сваіх праблем, не як жаночых, а як праблем сацыяльных і палітычных, нам не выйсці на ўзровень іх вырашэння, на ўзровень сацыяльнага дзеяння.

## Дыпламатыя ў асобах

**27 кастрычніка Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Нідэрландаў Шурд Госес уручыў вярыцельныя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Станіславу Шушкевічу.**

— Мой урад усведамляе цяжкасці, якія перажывае маладая Беларусь, і гатовы садзейнічаць таму, каб ваша рэспубліка выступала на міжнароднай арэне з пазіцыі дэмакратыі, шматпартыйнасці і павагі правоў чалавека, — заявіў пасол.

Станіслаў Шушкевіч выказаў ад імя беларускага народа падзяку Нідэрландам за дапамогу ў пераадоленні вынікаў чарнобыльскай катастрофы і паабяцаў, што ў новага пасла будзе магчымасць пераканацца ў працавітасці і дружалюбнасці людзей Беларусі.

Пасля ўручэння вярыцельных грамат і абмену прамовамі паміж Шурдам Госесам і Станіславам Шушкевічам адбылася гутарка, у якой прыняў удзел першы намеснік міністра замежных спраў Георгій Таразевіч.



**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Нідэрландаў Шурд Госес**

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1941 года ў Амстэрдаме. Закончыў юрыдычны факультэт Лейдэнскага універсітэта.

На дыпламатычнай рабоце з 1967 года. Займаў розныя пасады ў міністэрстве замежных спраў краіны. Перад назначэннем на пасаду пасла Нідэрландаў у Польшчы ў 1993 годзе з'яўляўся намеснікам начальніка дэпартамента еўрапейскага супрацоўніцтва.

Жанаты.

**Белінфарм.**

БАЦЬКАЎШЧЫНА

## З чаго пачынаецца Радзіма?

І гэтае, і іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у нас, яшчэ толькі пачынаючых у поўнай меры ўсведамляць сябе дзецьмі нашай сінявокай Беларусі, знаходзяць адказ, як толькі трапляеш у запаведную зону — музей пад адкрытым небам.

Супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту зрабілі ўсё, каб адчуванне Радзімы, прыналежнасці да яе старажытнай культуры і гісторыі не пакідала наведвальнікаў за ўвесь час экскурсіі.

Дакрануліся да вытокаў Беларусі і школьнікі. Вучні 8-га "Б" класа 4-й сярэдняй школы г.Мінска са сваім класным кіраўніком пры садзейнічанні МУС пабывалі 17 кастрычніка ў музеі. Надоўга запомніцца школьнікам і гэты дзень, і захапляючы расказ экскурсавода А.В.Астаповіча.

❑ Экскурсія па Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і быту.

**Фота Пятра КАСТРАМЫ.**





*Чужие тайны в своей стране*

# Полесье: эта "непонятная" дочернобыльская радиация

**Алексей ДУБРОВСКИЙ, депутат Пинского городского Совета**

**Вначале статистические данные, которые, я уверен, никто не оставит без внимания. В период с 1963 по 1985 (дочернобыльский) год число онкологических заболеваний в целом по Беларуси увеличилось на 3 процента.**

**В Брестской области за это же время рост их составил 10 процентов.**

**В Пинском районе Брестской области — 22 процента.**

**В Столинском районе с 1963 по 1985 число раковых больных возросло на 32 процента.**

**А теперь сопоставим последние две цифры с тем фактом, что начиная с 1986 (чернобыльского) года онкологическая заболеваемость в целом по Беларуси увеличилась на 27 процентов...**

Впечатляет? Так что ж происходило на востоке Брестской области начиная с 60-х годов, почему только в наши дни выясняется, что полешуки задолго до Чернобыля страдали от загрязнения местности? Я как специалист-эколог немало сил потратил на изучение этой проблемы и могу сделать предположение: причиной явились как в целом радиоактивные осадки от атомных взрывов в атмосфере, которые в 60-е годы активно проводили ядерные державы, так и конкретно "малопонятные" испытания на обширном Столинском военном полигоне. (Мне уже доводилось рассказывать в печати о "странных" пушках, выстрелами из которых управляли тут на расстоянии 20 километров.)

Вся штука в том, что Полесье в ту пору являлось благоприятной зоной для интенсивного перехода цезия-137 в растения и молоко. Этому способствовала сильная обводненность территории, когда цезий-137, обладая хорошей растворимостью, попадал в большом количестве через траву и молоко в организм человека. Такой факт ученые впервые обнаружили здесь, на Полесье, в 60-е годы, что явилось причиной детального обследования региона специальной экспедицией сотрудников Института биофизики Министерства здравоохранения СССР, радиологической лабораторией Гомельской областной СЭС, Центральной радиологической лабораторией Минздрава УССР и Почвенного института Министерства сельского хозяйства БССР.

В задачи экспедиции, которая работала на Полесье с 1967 по 1970 год, входило:

1. Выявить зоны с повышенной миграцией цезия из почвы в организм человека.

2. Определить дозы облучения и дать оценку степени риска.

3. Разработать профилактические мероприятия для исследуемой местности, если возникнет в них необходимость.

Объектами исследования служили пастбища, где отбирались пробы почвы и трав, животноводческие фермы, пахотные угодья, озера. Изучалась структура питания и характер водоснабжения населения, определялось содержание цезия в организме местных жителей.

Было обследовано 20 районов в 12 областях БССР, УССР и РСФСР. На основании полученных данных ученые составили молочно-цезиевую карту и отчет, представленный книгой "Глобальные выпадения цезия-137 и человек". Вышла она в 1974 году в "Атомиздате" тиражом 1655 экземпляров. Исследователями было отмечено, что наибольшая концентрация цезия — до шести крат по сравнению с суглинками — содержится в траве с торфяных и дерново-глеевых обводненных почв.

Перерасчет показателей молочно-цезиевой карты на кюри/кв.км выявил загрязненность Пинска и района на 1970 год около 5 кюри/кв. км. Зараженность луговых трав находилась в четкой взаимозависимости от уровня грунтовых вод. Наблюдения в Брестской области показали, что в траве на осушенном болоте цезия в 10 раз меньше, чем на неосушенном. Из исследованных культур в картофеле содержалось наибольшее количество цезия, в свекле — минимальное. Больше всего цезия накапливали грибы и ягоды. Интересны сведения по мясу: говядина, по данным ученых, была загрязнена всего лишь в два раза меньше, чем допускают нормативы сегодня, и в 10 раз больше, чем допускали нормативы сразу после чернобыльской катастрофы.

Интересен прогноз, сделанный учеными до 2000 года. Из приведенной в отчете таблицы я узнал, что в 1990 году мы должны были потреблять все еще "грязное" молоко, хотя и ниже допускаемых уровней, установленных после аварии на 1990 год.

Но нам важен результат проведенных экспедицией исследований, связанных непосредственно со здоровьем людей.

Ученые тогда только предполагали, что облучение большого количества населения малыми дозами может привести к появлению физиологических нарушений: бесплодию, раннему старению, врожденным уродствам, мертворождаемости, увеличению смертности новорожденных младенцев, слабоумию, а также катарактам, учащению случаев лейкемии. Авторы заостряли внимание на недопустимости недооценки потенциальной опасности для будущих поколений и устанавливали предел дозы от всех источников излучения в 5 бэр за 30 лет.

И хотя ученые решили, что ничего опасного для здоровья людей не случится, тем не менее профилактические мероприятия были разработаны. Они касались создания условий, при которых цезий минимально поступает из почвы в молоко. К ним относятся:

1. Перевод скота на фуражные культуры (люпин, свекла).

2. Перевод скота на чистые корма, чтобы обеспечить чистым молоком только местное население.

3. Выдерживание скота перед забоем в течение 4—6 недель на чистом рационе с ежедневной добавкой поваренной соли.

4. Ограничение потребления людьми картофеля и грибов.

5. Варка картофеля, грибов и овощей с обязательным сливанием воды через 5 минут кипячения.

Эти простые мероприятия вдвое уменьшают поступление цезия в готовую пищу.

А что мы услышали от руководящей коммунистической номенклатуры в 1986 году? Под каким сукном оказались рекомендации людям?

Но это "относительные" мелочи. А как можно было еще ранее обезопасить миллионы полешуков — вот задача. И тут начинаются загадки. Я уже говорил, что экспедиция установила на примере брестских колхозов, что поступление цезия в растения на осушенных болотах уменьшается примерно в 10 раз. Это — главное профилактическое мероприятие. И поэтому то, что началось в начале 70-х годов на Полесье, — тема особого разговора. Отпущено было 2 миллиарда рублей на осушение Полесской низменности, но так странно, с такой поспешностью, что ученые не успели даже сделать обоснование. До сегодняшнего дня техноэкономическое обоснование защиты поймы Припяти от наводнений не согласовано в Совмине.

Кто ответит на вопрос, почему на "Карте радиационной обстановки на территории БССР по состоянию на январь 1990 г." плутоний показан не далее чем в 30 километрах от Чернобыльской АЭС, а сегодня мы находим его в почвах рядом с Пинском и Столином в дозах, намного превышающих допустимые уровни? Я уже не говорю о границе зоны загрязнения — той давней, а также и послечернобыльской: они в основном совпадают по максимуму радиоактивных осадков...

Чтобы иметь достоверные факты, касающиеся 60-х годов, Пинский горсовет по моей просьбе обратился в республиканский Институт почвоведения и агрохимии как к участнику той давней экспедиции с просьбой представить полный отчет. Реакция была более чем странной. Ответ мы почему-то получили из Республиканского центра радиационного контроля и мониторинга природной среды: никакой радиации на Полесье в 1967 году не было. Об отчете 20-летней давности — ни слова.

Но тем, кому теперь за сорок, прекрасно помнят, как в 60-е годы у нас вдруг объявилось белокровие. Умирали молодые люди, умирали здесь, на Полесье, казалось бы, в совсем чистых деревнях. До сегодняшнего дня навалившаяся беда в памяти людей...

Эта статья, надеюсь, хотя бы отчасти ответит на вопрос, поставленный 8 августа с.г. в публикации "Беда с Ольманами. И не только с ними". Заведующая детским отделением республиканского диспансера НИИ радиационной медицины Л.М.Василевич недоумевает, почему в этой деревне при загрязненности почв в 1—5 кюри на квадратный километр у многих из 250 детей поражен желудочно-кишечный тракт, а у 72 здоровье в угрожающем состоянии. Напомню, что деревня Ольманы расположена в западной части Столинского военного полигона. Напомню и то, что Брестская область после Гомельской имеет наибольшее количество онкологических заболеваний, а не Могилевская, как следовало бы ожидать.

Из всего сказанного можно заключить, что уже десятилетия назад наш край, в том числе город Пинск, должен был находиться на особом положении. А то, что случилось в Чернобыле, по моему мнению, "прикрывает" не менее страшное преступление.

*Осторожно! Бракоделы!*

## На ходу подметки отрываются

**— так можно перефразировать известную поговорку в отношении "мастеров" из фирмы по ремонту обуви "Ялина". Качество их работы таково, что подметки нередко отваливаются после ремонта через несколько дней.**

Кажется, единственное, чем могут гордиться ее работники, — это терпение. В ремонт после ремонта принимают без единого слова. Правда, с тем же печальным результатом. И так до бесконечности. Поэтому терпением уже нужно запасаться клиентам.

Черным стал для меня тот день, когда, купив новые туфли, решил обратиться в одну из мастерских вышеназванной фирмы, что в микрорайоне Уручье, чтобы приклеить профилактику на подошву. В целом, надо сказать, я человек терпеливый, но, когда в шестой раз пришел забирать обувь, терпение мое лопнуло.

Прямо оттуда позвонил главному инженеру фирмы Ж.Ц. Еременковой (фамилию выяснил по телефону в приемной). Та извинилась за своих подчиненных и, сославшись на то, что те пользуются почему-то некачественным клеем, предложила привезти обувь в фирму, где все сделают по высшему разряду.

Надо сказать, предложение несколько удивило. Зачем ехать на другой конец города, если есть мастерская рядом с домом? Да и вообще, способ ли это решения вопроса? Кроме того, ведь сотни других несчастливцев будут по-прежнему страдать, пока в этой мастерской не изведут злополучный клей.

Словом, оставил туфли еще раз. А вдруг повезет! Забрав их и проносив пять дней, понял, что на везение, если ты столкнулся с "Ялиной", рассчитывать не приходится.

Вновь позвонил главному инженеру, чтобы уточнить некоторые вопросы. Например, для чего пользоваться бракованным клеем, если ясно, что со временем он лучше не станет? Почему клиенты должны тратить столько времени и какая компенсация, кроме произнесенных сквозь зубы извинений, им положена? Каково вообще финансовое положение фирмы, которая живет тем, что берет деньги за брак?

Однако Жанна Цезаревна на этот раз сказала, что по телефону отвечать на вопросы не будет. Если мне очень нужно что-то выяснить, то должен приехать к ним в офис.

Концовка же нашего разговора была прямо фантастическая.

— Пишите в своей газете, что хотите, — твердым голосом сказала Жанна Цезаревна, — но если исказите факты, мы подадим на вас в суд. У одной газеты мы уже выиграли процесс и получили деньги за моральный ущерб...

Вот так!

Сижу в раздумье: писать или не писать про бракоделов? А вдруг в самом деле потащат в суд да еще отсудят сколько-то тысяч за то, что посмел возмутиться их работой?

И все же, наверное, писать нужно. Хотя бы для того, чтобы другие знали, что лучше не связываться с "Ялиной".

А если соберутся все пострадавшие от "Ялины" да на нее в суд подадут? Свидетелей, наверное, придется несколько дней подряд опрашивать. Пишите...

**Владимир САМОЙЛОВ, обозреватель "Народной газеты".**



## Зварот праўлення Згуртавання прадпрымальнікаў Беларусі да сяброў згуртавання, прадпрыемстваў усіх форм уласнасці, грамадзян Рэспублікі Беларусь

З-за некампетэнтных дзеянняў урада эканоміка Беларусі апынулася ў катастрафічным стане. За І паўгоддзе 1993 года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года нацыянальны даход знізіўся на 14 працэнтаў, цэны выраслі ў 9—14 разоў, вытворчасць мяса і малака скарацілася адпаведна на 14 працэнтаў і 16 працэнтаў, аб'ём вытворчасці ў прамысловасці знізіўся на 16,3 працэнта, колькасць стратных прадпрыемстваў павялічылася з 379 да 547. Жыццёвы ўзровень жыхароў абвальна зніжаецца. З-за адсутнасці энергарэсурсаў спыняюцца многія прадпрыемствы.

Такая сітуацыя ёсць вынік непаслядоўнай, непрафесійнай дзейнасці кабінета В.Кебіча на працягу ўсяго перыяду яго дзейнасці на гэтай пасадзе. Менавіта ўрад В.Кебіча спрыяў згортванню эканамічных сувязей з партнёрамі за межамі краіны шляхам увядзення "мер по защите потребительского рынка", пастаянна праводзіў згубную палітыку татальнага рэгулявання цэн шляхам датацый і штучнага падтрымання занятасці, што не магло не прывесці да ўвядзення ўдушаючай для вытворчасці і прадпрымальніцтва сістэмы падаткаў і збораў, расцягвання нацыянальнага багацця краіны больш "рынычнымі" суседзямі. Гэта не дало магчымасці ўвесці нацыянальную валюту і замацаваць суверэнітэт. Урад пастаянна з'яўляўся і з'яўляецца ініцыятарам разнастайных авантурных захадаў па вырашэнню эканамічных праблем: "адзіная рублёвая зона" — "калектыўная бяспека" — "славянскі саюз" — "рублёвая зона новага тыпу" — "абноўлены саюз". А вынік роўны нулю.

Яшчэ ў 1990 годзе, у самым пачатку дзейнасці Вярхоўнага Савета, дэмакраты-рэалісты выступілі з прапановамі аб стварэнні неабходных умоў для пераходу да рынычных адносін,

каб стварыць спрыяльныя ўмовы для інвестыцыйнай дзейнасці, уратаваць нашу эканоміку ад разбурэння, каб прадухіліць раскраданне народнай маёмасці, падрыў вытворчасці і збядненне людзей. Але нічога гэтага не было зроблена.

Праўленне Згуртавання прадпрымальнікаў Беларусі заклікае вас:

1. Актыўна ўключыцца ў мерапрыемствы па тэрміновай адстаўцы кіраўнікоў Савета Міністраў, па стварэнню кааліцыйнага ўрада, прызначэнню датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савета, па падтрымцы дэмакратычных партый і рухаў.

2. Працаваць у першую чаргу на сябе. Таму што праца на сябе — гэта праца на нашу Радзіму. Мы павінны ўсвядоміць, што нацыянальныя каштоўнасці ў нашых руках, у руках народа лепш захоўваюцца, выкарыстоўваюцца і памнажаюцца. Наменклатурная большасць і ва ўрадзе, і ў ВС, ды і на месцах, не можа прыняць нармальныя ўмовы падаткаабкладання для вытворцаў. Яны могуць толькі размяркоўваць, спажываць бюджэтныя сродкі, заглядваць у кішэню багатым сыравінаю суседзям ды прадаваць незалежнасць.

3. Стварыць недзяржаўны фонд падтрымкі пачынаючых беларускіх прадпрымальнікаў, незалежнай прэсы і мерапрыемстваў згодна з пунктам 1-м гэтай заявы. Сродкі неабходна пералічваць на рахунак Згуртавання прадпрымальнікаў Беларусі N 700320 у КБ "Дукат" г.Мінска, МФО 153001767. Абавязковая паметка: "У падтрымку пачынаючых прадпрымальнікаў, дэмакратычнай незалежнай прэсы і арганізацыйных мерапрыемстваў па выбарчай кампаніі".

Зварот прыняты на пашыраным пасяджэнні 16 верасня 1993 г.

**Праўленне ЗПБ.**

*Нам стала вядома*

## Хто хацеў, той паляцеў?

**Як паведамілі карэспандэнту РІДа ў мінскім АВІРы, апошнім часам намецілася змяншэнне жадаючых паехаць на пастаяннае месца жыхарства за мяжу.**

Калі ў 1992 годзе Мінск пакінулі 2587 чалавек, то за дзевяць месяцаў 1993 года — 1573. Змянілася і геаграфія месцаў новага паселішча: ЗША, трэція краіны, у той час як у самым пачатку дзевяностых гадоў найбольш жаданым быў Ізраіль. Разам з тым намецілася тэндэнцыя вяртання нашых былых суайчыннікаў на радзіму. Кожны месяц паступае ў сярэднім па 5 заяў, у асноўным з Ізраіля.

**Юрый ЛЯШКЕВІЧ.**

## Айчынны газавы пісталет — гэта танна! І, кажуць, надзейна

**У бліжэйшыя два месяцы ў магазінах Беларусі з'явяцца айчынныя газавыя пісталеты, да вытворчасці якіх ужо прыступіў адзін з гродзенскіх заводаў.**

Нядаўна прайшоўшыя рабочыя выпрабаванні навінкі паказалі, што доследныя ўзоры нічолькі не ўступаюць па тэхнічных параметрах імпартным аналагам, ды і шмат таннейшыя. Яны будуць каштаваць 150—200 тысяч рублёў.

**Андрэй ЯНЧУК.**

*Звонки в редакцию*

## Приезжайте за бензином в Псков. Нет проблем

На днях в нашей газете помещены снимки с минских автозаправочных станций, на которых длинные вереницы машин в надежде заполнить баки бензином. В редакции стали раздаваться недоуменные звонки граждан, приехавших к нам из ближнего зарубежья.

— Я из Пскова. Здесь в командировке. Что случилось с Беларусью? У нас нет проблем с бензином. Зная ваши беды, меня просили разузнать, кому у вас нужен бензин. Псковские организации готовы поставить его в неограниченном количестве. Скажите, кому передать их координаты?

— Я приехал из Эстонии. Пошлите своих чиновников в Таллинн, пусть поучатся, что надо делать, чтобы людям жилось нормально. У нас и с бензином нет проблем, и с продуктами. Что же у вас, некогда благодатном крае, вдруг случилось?

И в самом деле, что?

**Антон СИНИЦЫН.**

*Криминальная хроника*

## "Великий комбинатор"

Гражданин Г., ранее судимый за финансовые махинации, открыл в банке счет. Затем выписал чек на 250 тыс. рублей и, дописав перед суммой цифру "два", отправился по магазинам города Барановичи. Там, за определенное вознаграждение кассирам, сумел обналичить сумму в 2 млн. 250 тыс. рублей. Но вскоре "великий комбинатор" был задержан.

**Игорь ПАЛЬМОВ.**

## Страсти на границе

**Похоже, искатели приключений, зарабатывающие себе на хлеб у белорусско-польской границы, совсем обнаглели.**

У предпринимателя из немецкого города Дрездена прямо в зоне таможенного досмотра угнали автомобиль, в котором находились 400 долларов США. Два других грабителя "вытрясли" 200 дойчмарок у жителей Москвы и Кемерова, но, правда, были задержаны.

**Олег СУПРУНЮК, РИД.**

*Факт*

## Тулупчик не желаете?

**Забросать Европу овчинными полушубками намеревается белорусско-французское предприятие "Витсерн" при Витебском мехкомбинате.**

Французская сторона обеспечит производство овечьими шкурами из Средней Азии и новейшим оборудованием.

## Мы — пионеры

**Пионерское движение на Могилевщине, похоже, переживает свое второе рождение.**

В области и ее столице стали появляться новые пионерские отряды и дружины. Например, в СШ N 6 г.Могилева уже более ста пионеров, а у вожатой Татьяны Желудковой нет отбоя от кандидатов.

**Людмила АНОШКИНА, РИД.**

## Переориентировались

**По сведениям БелаПАН, количество автобусных маршрутов из Беларуси в страны Балтии, Россию и на Украину сокращаются. Зато в Польшу их за последние два года открыто 23.**

Рассматривается также возможность организации регулярного автобусного сообщения с Чехией, Германией и другими государствами Европы.

**Ирина СЕРЕГИНА.**

*Лісты з глыбінкі: час і людзі*

# 1Y. Эх ты, доля паляшуцкая...

**Віктар ХАРОШКА**

Апошняя навіна з дому крыху збянтэжыла: бацькі здалі карову. Адразу не паверыў. Мінулы год сам угаворваў іх, прасіў аб тым жа. Усё роўна малака не ядуць. І не таму, што не любяць. Не рэкамендуюць ужываць таму, што забруджана радыенуклідамі.

— Навошта, — кажу, — трымаць? Толькі турботы лішнія. Сена, буракі, іншы корм здабываць трэба. Вы ж пенсіянеры ўжо.

— Не, — адказваў бацька. — Пабачыш, не змогуць людзі ў вёсцы без каровы. Пройдзе які год-другі, пачнуць абіваць парогі дырэктара саўгаса. І малако сваё будуць есці.

І раптам — няма ў двары каровы...

— Э-э, сын, ніколі б я не здаў жывёліны. — Сяджу насупраць бацькі і слухаю яго горкую споведзь. — У апошнюю праверку лейкемію выявілі ў нашай Лыскі. Дык жа ці чакаць, каб яна ў хляве прапала? Пакуль можна было — здалі. Вось што цяпер рабіць?

Ведаю, што ў бацькі на гэтае пытанне даўно ўжо ёсць адказ. Тым не менш пярэчу:

— А можа, і не трэба яна вам?

— Трэба. — Бацька палез за тытунём. Хвалюецца. — Вунь Толік Іванаў купіў цялушку, Жэня прыдбала кароўку. Паглядзі на статак. Дваццаць галоў нядаўна ў ім было. А сёння?

Мае аргументы яму, ды хіба толькі бацьку, не довад. Вось ён, прыклад, на вуліцы.

Гэта ў першыя радыяцыйныя гады людзі напалоханыя былі. Баяліся перш за ўсё за дзяцей. Тым больш што ў мясцовы магазін малочныя прадукты завозілі ледзь не па два разы на дзень. Малако, кефір, смятана, тварог, сыры. Што яшчэ больш патрэбна? Навошта трымаць карову?

Саўгас у той год перавыканаў усе магчымыя і немагчымыя планы па мясу.

Але ў нашай дзяржаве ўсё, як заўсёды, шыварат навыварат. Далі крыху народу "пабагаваць" і... перакрылі кранік.

Ва ўсялякім разе, сёння малако ў магазін завозіцца ў лепшым выпадку 2 разы на тыдзень. І то паспрабуй ухапі яго, калі прывозяць зусім няшмат. Хто бліжэй жыве, той купіць. А пакуль навіна дойдзе да канца вёскі, пакуль бабулька збярэцца і пракшандыбае 2 кіламетры, прадукту таго і след прастыне. Не бачаць малака і людзі, занятыя на вытворчасці.

І працэс пайшоў у адваротным накірунку. Зараз ледзь не ў кожным другім двары з'явілася свая карова. Пакінуў гадаваць цялушку і мой бацька.

Увогуле складваецца такое ўражанне, што на няшчасны палескі край махнулі рукой. Не можа ж так быць, каб два гады назад пражыванне ў вёсцы было пад вялікім сумненнем, і раптам усе льготы зняты. Раней у той жа магазін прыемна было заходзіць. Адной тушонкі на паліцах стаяла відаў пяць. Прычым па самай таннай цане. Няхай сабе яе размяркоўвалі па спісах, але людзі бралі...

Завозілі грэчневыя крупы, па кілаграму на чалавека ў месяц, мяса, каўбасы. Цяпер усё гэта такая рэдкасць. Так, для адводу вачэй, дадуць крыху — і на тым дзякуй.

Вялікаборцы і гэтую акалічнасць ператвараюць у жарт: "Трэба было нас тут затрымаць, дык падкідвалі нешта, як костку сабаку. Потым пазабіралі ўсё, і жывіце як хочаце".

Сумны жарт, што і казаць. Толькі ж гэта сама рэчаіснасць, якая прымушае многае пераасэнсаваць у жыцці.

Вялікі Бор становіцца такім, якім быў да радыяцыі. Успамінаюцца і ўсталёўваюцца традыцыі незапамятнай мінуўшчыны.

Я, напрыклад, адзін час пачаў нават забываць пах дамашняга тытуню. Сам не куру і дыму цярпець не магу. А вось водар высушанага тытуню дзедам пахне. Уяўляю, як добра курыльшчыкам. Калі ў магазіне навалам было цыгарэт, ніхто і не ўспамінаў пра тытунь. Хіба ў бацькі ды яшчэ ў двух-трох чалавек дзе-небудзь было прыхавана насенне: запас бяды не чыніць.

Затое сапраўднымі героямі пачалі адчуваць сябе запаслівыя мужыкі сёння. Як толькі пачаліся перабоі з дзяржаўным курывам, яны засеялі тытунём па дзялцы. Лічы, паўвёскі заходзіла да бацькі ранічкай за самакруткай. А ён частаваў суседзяў і кожнаму даваў каліва насення. Цяпер, як той аграном, дае парады па догляду за расадай, раслінамі:

— Пад маладзік пасей. Як зацвіце — пасынкуй. Паспее — высушы ў цяньку.

Увечары пройдзешся па вёсцы, паглядзіш: сядзяць дзядзькі з самакруткамі, шызы дым струменіць. А ў кожнага ў агародзе — тытунёвая плантацыя, любому спецыялісту на зайздрасць. І не баліць нікому галава, што нехта не паставіў у Гродна прадукцыю.

Дзед Алесь, той зусім катэгарычны:

— Калі нічога не будуць нам прывозіць — выжывем.

І выжывуць. Іншая справа, з якімі выдаткамі і вынікамі ў здароўі. Бо колькі ні кажы вялікаборцу, што яек ужываць у ежу нельга, накопліваюць праклятыя нукліды, будуе курнік і гадуе тузін куранят: у магазіне ж не купіш.

Пра свіней дык і гамону няма. Кожны гаспадар трымае не менш дзвюх. Гэта для сябе. А яшчэ ж і на продаж трэба. Колюць і вязуць на рынак у Хойнікі, а потым скардзяцца:

— Нейкія на машынах прыехалі, скупілі ўсё оптам і павезлі. Хойніцкім і не засталося нічога.

Так, наживаецца нехта і на працы вялікаборцаў. Прадаюць жа яны свініну на базары па даволі таннай цане. У Гомелі, ва ўсялякім разе, такое ж мяса і сала амаль удвая даражэйшае.

Як бы ні круціла жыццё, якіх бы выпрабаванняў ні падкідвала — жыве паляшук. Працуе на зямлі, расціць сады, будуецца на доўгія гады. І гадуе дзяцей, думае пра будучыню. Не ў кожную сельскую школу нават у чыстых ад радыяцыі раёнах ходзіць больш за 180 дзяцей. Не ў кожнай вёсцы перапоўнены дзіцячы садок.

Толькі б дзяржава больш клапацілася пра пакрыўджаны лёсам гэты куток і яго прагных да жыцця людзей!

*Хойніцкі раён.*

Народная газета

*Поздравляем!*

**Тансу ОКАНДАН:**

# “Пусть у наших народов будет счастливое будущее!”

**Сегодня исполняется 70 лет со дня образования Турецкой Республики. С Чрезвычайным и Полномочным Послом Турецкой Республики в Республике Беларусь Тансу Окандан беседует политический обозреватель "Народной газеты" Сергей Плыткевич.**

**— Господин посол, от имени всех читателей "Народной газеты" позвольте поздравить Вас с национальным праздником — 70-летием образования Турецкой Республики. И хотя повод для нашего интервью праздничный, но, если Вы не против, давайте поговорим не только об успехах и проблемах Турции, но и о нашей республике.**

— Конечно, конечно...

**— Я надеюсь, Вы не обидетесь, если я скажу, что большинство жителей Беларуси не очень хорошо знают историю Вашей страны. В каких условиях 70 лет назад была провозглашена Турецкая Республика?**

— Безусловно, я с пониманием отношусь к неизвестию простыми людьми историй других стран. Я должен признаться, что тоже знал совсем мало о Беларуси до того, как начал здесь работать. И сейчас я вижу тот контраст между недостатком информации о наших двух странах и взаимным интересом, который проявляют друг к другу и граждане Турции, и граждане Беларуси. И именно этот интерес является той основой, на которой мы можем развивать наши взаимоотношения. А недостаток информации о Турции ощущается не только в Беларуси, но и во многих западноевропейских странах.

Но вернусь к нашему национальному празднику. 29 октября 1923 года в Анкаре парламентом была провозглашена Турецкая Республика. Это произошло после национально-освободительной войны, которая последовала вслед за первой мировой войной. Для нас первая мировая война длилась до 1923 года. Район Анатолии — сердце Турции — был оккупирован союзническими войсками в конце 1919 года, после того как были завоеваны все окружающие Турцию страны, которые ранее входили в Османскую империю. Но это вызвало сопротивление народа. Национально-освободительное движение возглавил Мустафа Кемаль Ататюрк, который и является основателем Турецкой Республики. 19 мая 1919 года Мустафа Кемаль Ататюрк оставил Стамбул, который был разрушен, и направился в турецкий порт Сансун на побережье Черного моря. Парламент также присоединился к национально-освободительному движению и переехал в Анкару. Лишь 30 августа 1922 года наступила долгожданная победа. 24 июля 1923 года был заключен мирный Лозанский договор, а 29 октября 1923 года турецким парламентом в Анкаре была провозглашена Турецкая Республика. Провозглашение республики символизировало революционные преобразования в Турции. Страна превратилась из империи в национальное государство, а религиозная система была преобразована в строго светскую систему. За очень короткий период в Турции произошли радикальные политические, социально-экономические преобразования, изменилась законодательная система. Например, Турецкая Республика переняла швейцарский гражданский кодекс, итальянский уголовный кодекс, был изменен алфавит. Таким образом, современная Турция базируется на всех тех реформах, которые были проведены во времена первого президента республики Ататюрка.

**— Если судить по экспонатам в музее Ататюрка в Анкаре, то у Турции в 20-е, 30-е годы были очень тесные связи с Советским Союзом...**

— Еще задолго до Лозанского соглашения, сразу же после окончания национально-освободительной войны одним из первых был заключен договор с советской Россией. Во время национально-освободительной войны турецкий народ получал значительную материальную помощь со стороны России.


**— Любопытно, что и столица в Турции была перенесена из Стамбула в Анкару, как и в России — из Петербурга в Москву.**

— Стамбул был столицей Османской империи. Когда в результате исторических и политических преобразований центральная часть страны переместилась несколько на восток, то разумнее стало переместить восточнее и столицу государства.

**— Но в сороковые годы взаимоотношения между Турцией и Советским Союзом осложнились...**

— Можно сказать, что поворотным пунктом в истории советско-турецких взаимоотношений в этом веке явились события в 1946—1947 годах, когда Сталин открыто потребовал территориальных уступок со стороны Турции, определенных прав на пользование проливами Босфор и Дарданеллы. Кстати, эти притязания и стали позже одной из причин вступления Турции в НАТО.

Но с тех пор утекло много воды, и мы не должны слишком концентрироваться на таких датах. Сейчас мы живем в совершенно новой эре — эре мира. Сейчас мы должны укреплять взаимоотношения со всеми своими соседями.



❑ *Такой вот большинство из нас представляет Турцию...*

**— И перед Турцией, и перед Советским Союзом в восьмидесятые годы встали сходные проблемы. Руководство обоих государств пыталось их решить, правда, по-разному. И сегодня Турция переживает подъем, а государства бывшего СССР — острейший кризис. Почему, на Ваш взгляд, попытка реформирования экономики оказалась удачной у вас, а у нас фактически потерпела фиаско?**

— С 1980 года в экономике Турции начались коренные преобразования. Были открыты границы, в Турцию хлынули западные товары и валюта. С другой стороны, предприятия Турции начали стремиться выпускать конкурентоспособную продукцию. И в течение одного десятилетия экспорт товаров увеличился в пять раз, на таком же уровне произошло и увеличение импорта.

Что касается стран бывшего СССР, то они сейчас находятся на самом начальном этапе экономических преобразований. А первые стадии превращения экономики плановой в рыночную всегда сопровождаются социальными осложнениями. Но нужно смотреть в будущее с оптимизмом. Вот доживем до 2000 года и тогда сравним наши государства.

**— Господин Окандан, сегодня Вы являетесь послом в суверенной и независимой Беларуси, получаете очень много информации и знаете, что даже многие наши парламентарии воспринимают независимость Беларуси по-разному. Какой видите ее Вы? Хотелось бы, чтобы на этот вопрос Вы ответили не как дипломат, а как простой человек.**

— Разумеется, я чувствую, что нахожусь в независимой стране. Между Турцией и Беларусью происходят очень интенсивные контакты в политической, экономической и социальной сферах. С первых дней открытия нашего посольства в Минске мы стали выдавать визы на въезд в Турцию гражданам Беларуси. Только за десять месяцев текущего года мы выдали уже восемь тысяч двести пятьдесят виз. Между нашими странами установлено регулярное автобусное сообщение, а также чартерные авиалинии. Сейчас я прилагаю все усилия, чтобы у нас появились регулярные авиалинии. В Турции побывали многие творческие коллективы из Беларуси.

Но, как вы сами видите, наше посольство пока не имеет своего здания. Конечно, условия, в которых мы работаем сегодня, лучше, чем те, которые были, когда мы находились в гостинице "Беларусь". Но я рассматриваю наш офис на уровне статуса беженцев в здании СНГ и надеюсь, что белорусские власти сделают все возможное, чтобы найти соответствующее здание для посольства Турции. Кроме того, я пытаюсь убедить наше правительство в необходимости начать строительство здания посольства в планируемом дипломатическом городке.

**— В Москве в октябре произошли трагические события. Как оцениваете их Вы? Отразятся ли они на жизни других государств, в том числе и Беларуси?**

— Я дипломат. Поэтому я могу только пожелать, чтобы у России было стабильное, демократическое, ориентированное на реформы будущее, такое будущее, какого пожелает народ. Что касается Беларуси, то обычно независимое государство должно иметь свой путь развития, который никоим образом не зависит от событий в странах, которые с ним граничат. У соседей Турции тоже происходят коренные преобразования в их политических, экономических системах, но никогда Турция не изменяла свой политический или экономический курс из-за этих событий.

У меня есть огромное желание видеть Беларусь экономически развитой страной, с многопартийной парламентской системой и чтобы все состоялось в Беларуси прежде, чем мой срок службы здесь закончится. Я глубоко уважаю народ вашей страны, полагаю, что самым важным фактором для прекрасного будущего является человеческий. В Беларуси, бесспорно, есть высоко образованные люди, ваш народ трудолюбив, открыт и очень гостеприимен для внешнего мира. И это основная причина, которая делает меня оптимистом по отношению к будущему Беларуси.

**— Огромное спасибо, господин посол, за интервью, еще раз поздравляю Вас с национальным праздником.**

— Мне также хотелось бы передать наилучшие пожелания всем сотрудникам "Народной газеты" и вашим читателям! Пусть у наших народов будет счастливое будущее!

**Фото автора.**

*Пульс дня*

## Самая важная праграма прэзідэнта Клінтана

**Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан прадставіў кангрэсу праект рэформы сістэмы аховы здароўя краіны.**

Гэта самая важная праграма, распрацаваная яго адміністрацыяй амаль за 10 месяцаў знаходжання ва ўладзе, галоўны сэнс якой у тым, каб гарантаваць кожнаму амерыканцу, незалежна ад узроўню даходаў, пажыццёвую медыцынскую страхоўку.

## Супраць беднасці і галечы

**Пошукі шляхоў паглыблення інтэграцыйных працэсаў у Цэнтральнай Амерыцы і барацьбы з беднасцю і галечай, якая ахоплівае большасць насельніцтва, а таксама падпісанне спецыяльнага пратакола да генеральнага пагаднення аб эканамічнай інтэграцыі — такія асноўныя тэмы парадку дня XIV сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў рэгіёна, якая адкрылася ў гватэмальскай сталіцы.**

## 2 мільярды — на вецер. Здараецца такое і ў ЗША

**Кангрэс ЗША спыніў ажыццяўленне буйной навуковай праграмы, на якую ўжо затрачана каля 2 мільярдаў долараў.**

Адразу за палатай прадстаўнікоў сенат 89 галасамі супраць 11 прыняў рашэнне закончыць фінансаванне будаўніцтва ў штаце Тэхас буйнейшага ў свеце звышпаскаральніка элементарных часціц. Пабудаваны ўжо комплекс лабараторый будзе закрыты. Тысячам людзей, якія ўдзельнічалі ў яго стварэнні, давядзецца шукаць іншае прымяненне сваім сілам. Большасць заканадаўцаў палічыла немагчымым працяг праекта, у практычнай каштоўнасці якога яны сумняваюцца.

## Заява Казахстана ў ААН

**Ад імя дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама Грузіі і Малдовы Казахстан заклікае міжнароднае супольніцтва аказаць падтрымку стварэнню эфектыўнай антынаркатычнай аховы на тэрыторыі былога СССР.**

Аб гэтым заявіла пастаянны прадстаўнік Казахстана пры ААН Акмарал Арыстанбекава, выступаючы на пленарным пасяджэнні 48-й сесіі Генеральнай Асамблеі па пытанню аб міжнародным кантролі над наркатычнымі сродкамі.

## У Мьянме адкрыўся штогадовы аукцыён каштоўных камянёў

**Традыцыйны штогадовы аукцыён каштоўных і паўкаштоўных камянёў адкрыўся ў сталіцы Мьянмы Янгоне.**

У таргах прымаюць удзел прадстаўнікі больш чым 200 замежных кампаній, якія займаюцца вырабам і продажам ювелірных вырабаў. Урад Мьянмы, які валодае манаполіяй на разведку, здабычу каштоўных камянёў і гандаль імі, выставіў на аукцыён прадукцыі на суму звыш 19 мільёнаў долараў.

## Прафсаюзы Філіпін пагражаюць забастоўкай

**Прафсаюзныя цэнтры Філіпін прыгразілі пачаць агульнанацыянальную забастоўку, калі ўрад не задаволіць іх патрабаванне аб павышэнні зарплаты.**

Яно было вылучана ў сувязі са зніжэннем курсу нацыянальнай валюты ў адносінах да долара. Для Філіпін, якія амаль поўнасцю залежаць ад імпарту тавараў і сыравіны з-за мяжы, гэта азначае значнае павышэнне цэн.

## Бразілія стварае нацыянальнае касмічнае агенцтва

**Бразільскі парламент адобрыў урадавы праект стварэння нацыянальнага касмічнага агенцтва (НКА), у функцыі якога будзе ўваходзіць распрацоўка касмічнай тэхнікі і запуск уласных спадарожнікаў.**

Улады Бразіліі спадзяюцца, што стварэнне агенцтва адкрые краіне доступ да навейшай касмічнай тэхналогіі.

# Да рублёвай зоны — праз часовыя грашовыя знакі

**Ігар ГАЛКІН**

**Для стварэння рублёвай зоны новага тыпу рэспублікі СНД павінны правесці уніфікацыю грашовых сістэм, магчыма, увесці часовыя грашовыя знакі і вырашыць іншыя прынцыповыя пытанні, лічыць намеснік міністра фінансаў Расійскай Федэрацыі Андрэй Казьмін.**

Ён расказаў карэспандэнту ІТАР—ТАСС аб рабоце прадстаўнікоў Расіі, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Таджыкістана і Узбекістана пасля падпісання шматбаковага пагаднення "Аб практычных мерах па стварэнню рублёвай зоны новага тыпу".

Рублёвая зона — гэта адзіная грашовая і мытная прастора, адзіны парадак арганізацыі валютнага рынку, уніфікаваная прававая база. Для іх арганізацыі і кантролю, таксама ж, як і для кантролю ўзятых рэспублікамі абавязацельстваў, патрэбны адзіныя параметры і механізмы. Нічога гэтага няма.

На думку Андрэя Казьміна, рэспублікі, падпісаўшы пагадненне, не імкнуцца актыўна ўводзіць нацыянальную валюту і не рвуцца да аб'яднання на аснове рубля. "З боку рэспублік намнога больш энергіі накіроўваецца на тое, каб атрымаць з Расіі наяўныя рублі, чым вырашыць прынцыповыя пытанні аб'яднання грашовых сістэм, — заўважыў намеснік міністра. — Але калі гэтым абмежавацца, у нас не пойдуць плацяжы паміж прадпрыемствамі, мы не зможам паслаць у суседнюю рэспубліку пасылку, грашовы перавод або пералічыць пенсію, адным словам, грош цана гэтай акцыі".

Да канца ліпеня гэтага года рэспублікі аплачвалі рублёвай наяўнасцю пастаўкі расійскіх тавараў вытворчага прызначэння. Пасля адмены ў абарачэнні старых грашовых купюр гэтая практыка, якая наносіла шкоду Расіі, спынілася.

"Наша пазіцыя заключаецца ў тым, што аб'яднанне грашовых сістэм не павінна зводзіцца да пастаўкі ў суседнія рэспублікі наяўных рублёў, — падкрэсліў Казьмін. — Аб'яднанне павінна быць поўным як у наяўным, так і ў безнаяўным абароце. Але для гэтага неабходна аб'яднанне разліковаплацежных механізмаў. Яшчэ да аб'яднання трэба забяспечыць абарону безнаяўных плацяжоў ад злоўжыванняў, вядомых, у прыватнасці, як фальшывыя авіза. Калі Цэнтральны банк Расіі правёў сур'ёзную работу па ўзмацненню кантролю за крыніцамі плацяжоў, дык у рэспубліках блізкага замежжа да яе не прыступалі і пры аб'яднанні безнаяўнага абароту наяўныя рублі зноў могуць пайсці на аплату тавараў вытворчага прызначэння".

У пагадненні запісана: першым крокам на шляху стварэння рублёвай зоны новага тыпу з'яўляюцца абавязацельствы бакоў забяспечваць устойлівасць курсаў грашовых адзінак, якія абарачаюцца ў гэтых краінах, у адносінах да рубля і забеспячэнне ўзаемнай канверсуемасці. Ніякай узаемнай канверсуемасці няма, і цяжка гаварыць аб ёй.

Міністэрства фінансаў Расійскай Федэрацыі лічыць, што ва ўмовах, якія склаліся, было б правільна ўвесці ў рэспубліках часовыя грашовыя знакі. Пры гэтым былі б бачны рэальная вартасць грошай на тэрыторыі дадзенай рэспублікі і рэальны курс іх ў адносінах да рубля. Тым больш што абменны курс — ключавы паказчык для вызначэння рэальнай карціны фінансавага стану краіны. "Калі мы падпісваем пагадненне аб аб'яднанні, дык павінны ўказаць, на падставе якога абменнага курсу яно праводзіцца, як гэты курс будзе падтрымлівацца, каб не пацярпелі партнёры па супрацоўніцтву", — падкрэслівае намеснік міністра.

Так адна за другой усплываюць праблемы, без вырашэння якіх немагчымы адносіны "новага тыпу". А для вырашэння патрэбны час і воля партнёраў, заўважыў у заключэнне Андрэй Казьмін.



# Будь хозяином
ВАШ ДОМ, САД, ОГОРОД

*Личный опыт*

## Я с помидорами и весной, и зимой

**Хочу рассказать читателям "Народной газеты", как я добиваюсь того, чтобы томаты были у меня на столе практически круглый год.**

Во-первых, выращиваю помидоры в основном лежких сортов. Технология хранения очень проста и доступна даже малоопытным овощеводам. Здоровые зеленые помидоры в конце августа (а еще лучше — в сентябре) очень осторожно надо снять и также осторожно (чтобы не примять, не подавить — иначе лежать не будут) уложить в ящики на газету (у меня ящики из-под винограда) и укрыть опять же газетой.

Снимать плоды надо в прохладное время, не в солнцепек. Ящики штабелями в 8—10 штук ставлю один на другой в более прохладное, темное и сухое место — в сарай, на веранду, в гараж и т.д. Лучшая температура для хранения — 8—12 градусов тепла. Но такое бывает редко. Температуру не установишь — ее дает природа. Раз в 7—10 дней помидоры осматриваю, те, что портятся, — выбрасываю, зрелые идут в дело, остальные хранятся дальше. С наступлением устойчивых холодов вношу ящики в дом, в темный коридор, под койку и т.д.

И так до следующего лета семья обеспечена свежими плодами.

Все перечисленные ниже сорта в этом году дали обильный урожай как в теплице, так и в открытом грунте.

### 1. Сорта для летнего потребления

**Ультраранние. Отрадные.** Плоды средние, 60—80 г, красные, плотные. **МП-4 — крепыш**. Красные, крупные. Оба сорта — низкорослые, не подвязывать, не пасынковать. Начало созревания — 35—40-й день от высадки рассады.

**Ранние, низкорослые. Первая любовь**. Розовые, крупные и очень крупные. **Ружа, Вилина** — средние, красные, довольно-таки устойчивые к туманам (почернению), с дружным созреванием плодов.

### 2. Для летне-осеннего потребления

**Ранние и среднеранние**. **Ленивец, Дачные, Ручеек**. Малоприхотливые, красные, от мелких до крупных, консервно-салатные, хранятся до декабря.

#### Среднеспелые крупноплодные

**Малиновка.** Крупные, малинового цвета, **Величественные крабы**: 300—500 г, в теплице — до 1 кг, розовые. **Хурма**: желто-оранжевые, 100—300 г. Все — салатные, т.е. не хранятся.

**Огородник, Вежа** — сорта для теплиц, но хороши и на грядах, 100—250 г, красные, салатные, замечательного вкуса.

**Гибрид-2, Тарасенко.** Красные, мелкие — 50—70 г. Сорт способен дать в теплице 50 кг с куста. Дружно созревают, хорошо хранятся и консервируются.

#### Среднеспелые, среднерослые

**Пилот**. Светло-красные, плотные, 50—80 г. **Хабаровские розовые** — чуть крупнее **Пилота**, но розовые, устойчивые к туманам. Оба прекрасны для банок и хорошо хранятся.

### 3. Сорта для летне-осенне-зимнего потребления

**Мисс Америка** (США) — красно-матовые, плотные. **Де-Барао** красные, и **Де-Барао** желтые (Бразилия) — высокорослые, мелкие — до 100 г. Все они консервно-салатные. Хранятся до середины января, отдельные — до марта.

Сорта для теплиц, но хороши и на грядах. **Полочанка** — красные, устойчивы к болезням, 80—110 г, до 200 шт. на кусте, с дружной отдачей урожая. **Сольвейг** — 70—250 г, до 200 шт. на кусте, устойчив к болезням и к вредителю — картофельной нематоде. Оба — консервно-салатные, плодоносят до поздней осени и хранятся до февраля.

### 4. Помидоры для осенне-зимне-весеннего потребления

Титан — низкорослые, красно-матовые, круглые, 70—180 г, плотные, консервно-салатные, хранятся до апреля.

**Ричмонд рэд стар** (США), красные, по форме и весу — как куриные яйца, низкорослые, консервно-салатные, хранятся до мая.

**Жираф** — высокорослые, плоды 50—80 г, бледно-желтые, начинают буреть в конце августа, а созревают через 2—4 месяца. Хорошо хранятся до июня.

#### Помидоры для балконов

Балконное очарование — низкорослые, красные, мелкие — до 100 шт. на кусте.

#### Комнатные

Японский комнатный — куст до 30 см, плоды — 30 г. Очень декоративен. Красивый вазончик, усыпанный красными плодами, растет и плодоносит на окошке круглый год.

**Китайский комнатный** — 60—120 см, плоды — 60—80 г, плотные, красные, тоже плодоносит круглый год, хорош в теплице, где дает до 150 шт. на кусте.

Кого заинтересует мой опыт — помогу с семенами.

Семена высылаю наложенным платежом, они затарены в пакеты по 12—14 шт. (балконных и комнатных — по 6—7 шт.). Цена одного пакета полностью со всеми почтовыми услугами и пересылкой — 300 рублей. Желающие высылают мне письмо-заказ с указанием, каких семян и сколько пакетов требуется, и обязательно конверт с обратным адресом (можно без марок) по адресу: **213803, г.Бобруйск, 3. До востребования. Прокопчику Виктору Павловичу.**

Минимальный заказ — 3 пакета. Объявленная цена — до 1 декабря с.г.

Можно выслать деньги и переводом без письма. В этом случае в графе "Для письменного сообщения" заказать сорта и количество пакетов. Вышлю ценным письмом.

*Век живи — век учись*

## Вторая молодость... сковороды

**Многие хозяйки, особенно на селе, жалуются: купишь новую чугунную сковороду, а к ней, что ни начинаешь жарить, все липнет.**

Выход из положения бывалые хозяйки нашли. Чугунную сковороду перед использованием надо прожечь с солью на сильном огне. Когда соль станет коричневой, сковороду, еще полностью не остывшую, надо почистить этой же солью. Затем смазать растительным маслом и прокалить в духовке. После этого к сковороде пища прилипать не будет.

*Опыт Василия Черкаса*

## Маралий корень

Ботаники называют его левзея сафрановидная, большеголовик. А русские переселенцы на Алтае увидели, как олени-маралы копают осенью копытами корни какого-то растения и усердно его поедают. И дали название ему маралий корень.

Многолетнее травянистое растение до 1,5 м высотой с деревянистым корневищем и отходящими от него многочисленными тонкими корнями. На верхушках стеблей сидят одиночные крупные шаровидные соцветия. Цветки фиолетово-лиловые. Лечебной силой у левзеи обладает корневище с тонкими корнями. Женьшенеподобного действия. В народе говорят: "Маралий корень поднимает человека от 14 болезней и наливает его молодостью". Считается хорошим средством для повышения артериального давления, от импотенции. Неприхотлив в выращивании. Семена в стратификации не нуждаются. Можно в одно лето собрать их, заглубить в почву на 1—2 см и к осени получить хорошую рассаду. В культуре выращивать маралий корень очень легко.

*д.Любачин Лунинецкого района.*

*Читатель — читателю*

## Ускоренное размножение смородины

Осенью при уходе за кустами черной смородины я отбираю ветки и нарезаю черенки длиною 18—20 см. Высаживаю их на глубину около 15 см в бороздки хорошо обработанной и удобренной песчаной почвы. На одном погонном метре получается около 80 черенков. Присыпаю их землей, оставляю на поверхности по 2 почки. Делаю каркас из реек или жердочек. Весной, как только сойдет снег, обтягиваю каркас в два слоя пленкой и черенки часто поливаю.

В начале июня, вечером или днем в пасмурную погоду черенки выкапываю. Те, которые имеют хорошие корешки, высаживаю на грядку на расстоянии 25 см один от другого. В течение лета провожу прополку, рыхление почвы и подкормку жидким коровяком. Когда прирост черенков достигает 20 см, для появления ответвлений делаю прищипку. В сентябре для лучшего одревеснения прищипываю верхушки всех побегов. Высаженные осенью на постоянное место, на следующий год они уже начинают плодоносить.

Выращиваю черную смородину преимущественно сорта селекции БелНИИК-ПО: Белорусская сладкая, Минай Шмырев, Кантата-59, Золушка и другие.

С желающими могу поделиться этими сортами.

**211110, Витебская обл., Сенненский р-н, п/о Рулевщина, д.Опечки. Шитьковский Даниил Павлович**

НУ ЯК МОЖНА НАКАРМІЦЬ ГЭТЫ НАРОД, КАЛІ ЁН ПАСТАЯННА БЛЫТАЕЦЦА ПАД НАГАМІ...

Рисунок Олега Попова.

*Рубрику ведет Павел СТАСЕВИЧ. Тел. 29-60-42.*

## *Праграма тэлеперадач*

**Пятніца, 29 кастрычніка**

**Беларускае тэлебачанне**

**8.00.** Раніца рэспублікі.
**8.10.** Пад купалам Сусвету.
**8.25.** "Маналог з адступленнямі". Дак. фільм.
**8.55.** Дошка аб'яў.
**9.00.** Гісторыя Беларусі. 10-ы клас.
**9.30.** "Салодкі ручай". Тэлесерыял.
**10.25.** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. "Дынама" (Брэст) — "Дынама" (Мінск).
**12.00.** Пазіцыя ўрада. Актуальнае інтэрв'ю.
**12.15.** "У небе "Начныя ведзьмы". Маст. фільм.
**13.30.** Навіны.
**16.40.** "Папараць-кветка". Шоу-віктарына.
**17.30.** Навіны (з сурдаперакладам).
**17.40.** "Беламорскія ўзоры". Дак. фільм.
**17.55.** Рэпартаж з Рэспубліканскага семінара па вырошчванню насення кукурузы.
**18.25.** Навіны Бі-бі-сі.
**19.00.** Абласныя навіны (Магілёў).
**19.10.** "Вясна-94" — новая партыйная кааліцыя.
**19.40.** "Памінанне". Да Бацькоўскай суботы.
**19.55.** "Малахіт". Кінанарыс.
**20.05.** "1308". Конкурс эстраднай песні.
**20.35.** Кантакт.
**20.40.** Калыханка.
**21.00.** Панарама.
**21.35.** Пад купалам Сусвету.
**21.45.** Маст. фільм "Дзесяць гадоў без права перапіскі".
**23.30.** НІКа.
**23.45.** Акцёрскі клуб.

**Канал "Астанкіна"**

**8.00.** Навіны.
**8.20.** Алеся і кампанія.
**8.50.** Мультфільмы "Памылка дзядзечкі Агу".
**9.30.** Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
**10.20.** Амерыка з М.Таратутам.
**10.50.** Прэс-экспрэс.
**11.00.** Навіны (з сурдаперакладам).
**11.20.** Русскій міръ.
**12.00.** М.В.Гогаль. "Жаніцьба". Фільм-спектакль.
**13.30.** А.Дворжак. Серэнада для струннага аркестра мі мажор.
**14.00.** Навіны (з сурдаперакладам).
**14.25.** Брыдж.
**14.50.** Бізнес-клас.
**15.10.** Выступае ансамбль народных інструментаў пад кіраўніцтвам Н.Літвінава.
**15.20.** Алеся і кампанія.
**15.50.** Час-Ч.
**16.30.** Тэлемемуары.
**16.50.** Тэхнадром.
**17.00.** Навіны.
**17.20.** Рэха расійскага выбару.
**17.40.** Чалавек і закон.
**18.10.** Надвор'е.
**18.15.** Амерыка з М.Таратутам.
**18.45.** Поле цудаў.
**19.40.** Добрай ночы, малышы!
**20.00.** Навіны.
**20.40.** Чалавек тыдня.
**20.55.** "Марлоу — прыватны сышчык". 5-я серыя.
**21.55.** Азбука ўласніка.
**22.05.** "Сяргей Рахманінаў. Два жыцці". Фільм другі "Аз ваздам".
**23.00.** Навіны.
**23.25.** Палітбюро.
**24.00.** Музагляд.
**0.40.** Аўта-шоу.
**1.10.** Пляцоўка агляду.
**2.15.** Прэс-экспрэс.

**Канал "Расія"**

**7.00.** Весткі.
**7.20.** Патрабуюцца... Патрабуюцца...
**7.30.** Час дзелавых людзей.
**8.00.** Паралелі.
**8.15.** Кабарэ "Бязглуздзіца".
**9.10.** Паехалі.
**9.20.** Пігмаліён.
**9.50.** Рэтра-шлягер.
**10.20.** Белая варона.
**11.05.** "Санта-Барбара".
**11.55.** Пілігрым.
**12.40.** Сялянскае пытанне.
**13.00.** Весткі.
**13.25.** Шарман-шоу.
**14.55.** Тэлегазета.
**15.00.** Суседзі па планеце.
**15.30.** Там-там навіны.
**15.45.** Мінарэт.
**16.15.** "Помнікі Каканда". Дак. фільм.
**16.25.** Правінцыя.
**16.55.** "Адкрыццё студыі Дыснея ў Фларыдзе". 1-я серыя.
**17.45.** Аляксандр Барыкін. 20 гадоў на эстрадзе.
**18.45.** Свята кожны дзень.
**19.00.** Весткі.
**19.25.** "Сем дзён пасля забойства". Маст. фільм.
**21.00.** "Ведай нашых!"
**22.00.** Весткі.
**22.20.** Аўтаімгненне.
**22.25.** Зоркі гавораць.
**22.30.** Спартыўная карусель.
**22.35.** Вячэрні салон.
**0.05.** "Порах". Маст. фільм.

**Санкт-Пецярбург**

**12.05.** "Нябесныя ластаўкі". Маст. фільм.
**14.25.** Музычны момант.
**14.30.** Факт.
**14.40.** "Панарама Германіі. Горад Патсдам".
**15.40.** "Дамашні ўрок". Творчасць Віктара Някрасава.
**16.10.** Мультфільмы.
**16.45.** Новы Пецярбург.
**17.30.** Хакей. СКА — ЦСКА. У перапынках (18.05) — Музычны момант. Вялікі фестываль і (18.55) — Факт.
**19.45.** Спорт, спорт, спорт.
**20.00.** "Сёння".
**20.40.** Тэлемагазін.
**20.45.** Музычны момант.
**20.50.** Барометр.
**21.05.** "Тэатральныя эскізы".
**21.50.** Уік-энд.
**22.35.** Ваш стыль.
**22.45.** Факт.
**23.00.** "Жыццё з бацькам". Маст. фільм (ЗША).
**1.05—1.10.** Музычны момант.

**Субота, 30 кастрычніка**

**Беларускае тэлебачанне**

**8.00.** Раніца рэспублікі.
**8.10.** Пад купалам Сусвету.
**8.25.** "Дзесяць гадоў без права перапіскі". Маст. фільм.
**10.10.** "Руская песня". Фільм-канцэрт.
**11.00.** Тыдзень планеты.
**11.15.** "І ўсё ж такі — свята!" Мінскі гарадскі фестываль спорту і гумару.
**12.00.** "Дапамажы сабе сам".
**12.30.** Цяпло душы маёй. Творчасць інвалідаў.
**13.15.** Скарб-93. Фестываль талентаў.
**14.00.** Г.Гарэлава. Кантата "У год сусветнага пажару".
**14.35.** Дарожная азбука.
**14.55.** "Мой маленькі поні". Мультфільм.
**15.20.** Спявае С.Кульпа.
**15.40.** Хрысціянская праграма.
**16.10.** "Нов і К" — топ-10.
**17.10.** Дабрадзея. Праграма для людзей сталага ўзросту.
**17.40.** "Усё добра". Дак. фільм.
**19.15.** Хакей. "Цівалі" (Мінск) — "Спартак" (Масква).
**20.45.** Калыханка.
**21.00.** Панарама.
**21.35.** Пад купалам Сусвету.
**21.50.** "Кардэбалет". Маст. фільм (ЗША).
**23.45.** НІКа.
**24.00.** "Ля гасцінца". Музычная забаўляльная праграма.

**Канал "Астанкіна"**

**6.00.** Навіны.
**6.25.** Ранішняя гімнастыка.
**6.35.** Прэс-экспрэс.
**6.45.** Суботняя раніца дзелавога чалавека.
**7.30.** У свеце матораў.
**8.00.** Марафон-15 — малышам.
**8.30.** Тэлерадыёкампанія "Мір".
**9.55.** Музычны кіёск.
**10.25.** Твары ўлады.
**10.40.** Тэлешоу "50х50". "Крыштальны чаравічак". Частка 1-я.
**12.00.** "Ціхі Дон". Маст. фільм. 3-я серыя.
**14.00.** Навіны.
**14.30.** "Пэпі Доўгая панчоха". Маст. фільм. 7-я серыя.
**15.00.** Міжнародныя адносіны ў люстэрку эканомікі.
**15.30.** Спартыўная праграма "Ультра-сі".
**16.10.** Чырвоны квадрат.
**17.05.** Цудоўная сямёрка.
**18.00.** В.Арцёмаў. Трыпціх. "Сімфонія шляху".
**18.45.** "Стынгрэй". Маст. фільм. 2-я серыя.
**19.40.** Добрай ночы, малышы!
**20.00.** Навіны.
**20.40.** "Вайна Джэні". Маст. фільм. 3-я серыя.
**21.40.** Студыя "Рэзананс" прадстаўляе.
**22.00.** Каханне з першага погляду.
**22.40.** Надвор'е.
**22.45.** "Візіцёр". Мультфільм для дарослых.
**23.00.** Навіны.
**23.20.** На першынство свету па шахматах.
**23.35.** "Дэкалог-VI". Маст. фільм.
**0.35.** Аксамітавы сезон-93.

**Канал "Расія"**

**7.00.** Весткі.
**7.25.** Музычная калекцыя. Брас-квінтэт "Арыэс" (ЗША).
**8.00.** Формула-730.
**8.30.** Непазнаны Сусвет.
**9.00.** Студыя "Рост".
**9.30.** "Варлам Шаламаў. Некалькі маіх жыццяў". Дак. фільм.
**10.20.** Мульці-пульці. "Прамое пападанне".
**10.25.** Да Масквы — далёка.
**11.10.** Кінатэатр паўторнага фільма. "Фокуснік".
**12.25.** Тэлеэрудыт.
**12.30.** Канцэрт.
**12.40.** Сялянскае пытанне.
**13.00.** Весткі.
**13.20.** Пілігрым.
**14.05.** Наша справа.
**14.35.** Суайчыннікі. "Чужая зямля?"
**15.05.** Футбол без граніц.
**16.00.** Футбол. "Лакаматыў" (М) — "Спартак" (М).
**17.45.** "Зоркі Амерыкі".
**18.15.** Вуснамі дзіцяці.
**18.45.** Свята кожны дзень.
**19.00.** Весткі.
**19.25.** "Уінстан Чэрчыль. Шлях да вяршыні". 5-я серыя.
**20.25.** Тэлеэрудыт.
**20.30.** Маскі-шоу.
**21.00.** Кантрасты.
**21.40.** Рэпарцёр.
**22.00.** Весткі.
**22.20.** Аўтаімгненне.
**22.25.** Зоркі гавораць.
**22.30.** Спартыўная карусель.
**22.35.** Праграма "А".
**23.35.** "Жалезнай рукой". Маст. фільм (Польшча).
**1.15.** "Жоўтая падводная лодка".

**Санкт-Пецярбург**

**7.00.** Факт.
**7.15.** Мультфільм.
**7.25.** "Сябрам не здраджваюць". Маст. фільм.
**8.25.** "Жыццё з бацькам". Маст. фільм.
**10.30.** Хуткая дапамога.
**11.05.** Канцэрт па заяўках.
**11.35.** Тэледоктар.
**11.50.** "Ася". Маст. фільм.
**13.35.** "Сумаваць не трэба". Фільм-канцэрт.
**14.05.** Казка за казкай.
**14.50.** Сёння і штодзень.
**15.10.** Кірмаш вакансій.
**15.25.** Гістарычны альманах.
**16.30.** 13-е пытанне.
**17.30.** Спартыўны агляд.
**18.00.** Дарожныя прыгоды.
**18.10.** Вялікі фестываль.
**18.30.** Факт.
**18.55.** Камертон.
**19.40.** Экспрэс-кіно.
**20.00.** "Надоечы".
**20.40.** "На парозе ночы". Маст. фільм.
**21.30.** "Мацільда Кшасінская: фантазія на тэму..."
**22.30.** Ваш стыль.
**22.40.** Тэлекур'ер.
**23.05.** Тэлерулетка.
**23.20.—1.00.** Кіно Беларусі. "Свечка". Маст. фільм.

### *Надвор'е*

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца халоднае надвор'е, кароткачасовы снег, мокры снег. Тэмпература паветра ў Гродне, Мінску, Магілёве — каля нуля, Віцебску — ад 0 да 2 градусаў марозу, у Гомелі — ад 0 да 2 градусаў цяпла, Брэсце — 1—3 градусы вышэй нуля.

У наступныя двое сутак пераважна без ападкаў, толькі 31 кастрычніка ўдзень па паўночным усходзе пройдуць невялікія ападкі. Тэмпература паветра ноччу — 1—6 градусаў ніжэй нуля, па ўсходзе — да 9 градусаў марозу, ўдзень — ад 1 градуса марозу да 4 градусаў цяпла.

### *Астранамічны каляндар — 29.10*

Узыход і заход сонца: Мінск — 7.03, 16.44; Віцебск — 6.57, 16.30; Магілёў — 6.52, 16.33; Гомель — 6.48, 16.32; Гродна — 7.20, 16.57; Брэст — 7.14, 17.04.

Даўжыня дня ў Мінску — 9 гадзін 41 мінута.

Поўня — 30 кастрычніка.



НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Рэкламнае бюро — 29-34-05; факс — (0172) 27-33-96.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгінала. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя "Народнай газеты" прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы.

Рэдакцыйныя тэлефоны: грамадская прыёмная — 29-60-86; прыёмная галоўнага рэдактара — 29-60-08; намеснікі галоўнага рэдактара — 29-64-21, 27-22-16; юрыдычнае бюро — 29-69-68; карэктура — 29-62-12; стыльрэдактар — 29-64-04; мастак — 20-62-43; бухгалтэрыя — 29-60-21, 29-67-23; бізнес-бюро — 29-65-50; факс— 27-37-63.

Аглядальнікі па пытаннях дзейнасці: парламента рэспублікі, грамадска-палітычных арганізацый і рухаў — 29-66-04; урада рэспублікі — 29-68-12; мясцовых Саветаў — 29-61-56; дзяржаўных органаў — 29-64-78; аграрнай палітыкі — 29-60-42; экалогіі, ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай трагедыі і НТП — 20-41-82; сацыяльнай пераарыентацыі эканомікі — 20-52-65; сацыяльнай пераарыентацыі сферы абслугоўвання — 29-69-68; сацыяльнага вывучэння грамадскай думкі і аналізу пошты — 29-68-03; культуры і нацыянальнага адраджэння — 29-61-56; маралі і права — 29-69-87, 29-61-76; сацыяльнай абароны асобы — 29-69-87; адміністрацыйных органаў — 29-69-04; аператыўных падзей, фізкультуры і спорту — 20-83-97; палітычны каментатар — 29-65-01.

Тэлефоны карэспандэнцкіх пунктаў: у Брэсце —5-73-19; у Віцебску — 5-12-12; у Гомелі — 55-81-05; у Магілёве — 26-35-38; у Маскве — 365-16-44 у Берліне — (104930) 229-50-14.

**Адрас рэдакцыі: 220010, Мінск, Дом урада.**

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Адрас: Мінск, вул. К. Маркса, 38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка. 250 разоў у год.

Падпісана ў друк у 19.10.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва"Беларускі Дом друку". Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77.
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

**Галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**